Урбан В. В. (г. Мінск)

# Некаторыя асаблівасці дэрывацыі асабовых ацэначных субстантываў у беларускай дыялектнай мове

Сучасная беларуская дыялектная мова – гэта жывая сістэма, якая мае шэраг асаблівасцей лексічнага, фанетычнага, граматычнага, славаўтваральнага планаў і якая існуе і развіваецца паралельна з літаратурнай мовай. Шматлікія дыялектныя словы дакладна перадаюць розныя адценні пачуццяў, думак, перажыванняў і адначасова характарызуюць дзейнасць чалавека ва ўсіх яго сферах жыцця і дзейнасці. Калі прадмет (або аб'ект пазнання) задавальняе чалавека, то ў апошняга нараджаюцца пачуцці любові, спачування, захаплення і радасці. Калі ж аб'ект адхіляецца суб'ектам, то ўзнікаюць адмоўна афарбаваныя пачуцці: нянавісць, пагарда, расчараванне і інш.

Ацэначная лексіка змяшчае інфармацыю аб суб'ектыўным адлюстраванні аб'ектыўнага свету і эмацыянальных адносінах утваральніка маўлення да прадмета гаворкі. У аснове працэсу кваліфікацыі – параўнанне аб'екта з пэўным эталонам, прынятым у грамадстве. Такое суаднясенне непазбежна прыводзіць да ўзнікнення суб'ектыўнай ацэнкі – станоўчай або адмоўнай.

Важная роля ў працэсе кваліфікацыі належыць самому суб'екту, з пункту гледжання якога адбываецца параўнанне. Паняцце аб эталоне або норме можа імпліцытна змяшчацца ў семантыцы многіх слоў. Парушэнне межаў "нормы" ў большасці выпадкаў і прыводзіць да ўзнікнення ацэнкі. Параўнанне можа адбывацца па пэўных фізічных прыкметах і ўласцівасцях, якія маюць аб'ектыўны характар. Такія ацэнкі заснаваны на сапраўдным падабенстве ці непадабенстве аб'ектаў параўнання, таму можна гаварыць пра аб'ектыўную ацэнку. Лексіка, якой называюць не аб'ектыўна ўласцівыя прадмету прыкметы, а такую яго характарыстыку, што паказвае на адносіны суб'екта да прадмета, называецца суб'ектыўна-ацэначнай.

Вядома, што ў сучаснай беларускай літаратурнай і дыялектнай мовах выкарыстоўваюцца некалькі спосабаў перадачы суб'ектыўнай ацэнкі: лексічны, словаўтваральны, сінтаксічны і інтанацыйны. Але адным з асноўных і найбольш актыўных спосабаў выражэння суб'ектыўнай ацэнкі па-ранейшаму застаецца словаўтваральны, паколькі “найперш праз словаўтварэнне ажыццяўляецца пастаяннае папаўненне і ўдасканаленне слоўніка ў сувязі з развіццём грамадства, якое патрабуе ад мовы ўсё новых і новых слоў” [1, с. 3]. У гэтым выпадку свае адносіны да аб'ектыўнай рэчаіснасці апавядальнік выражае пры дапамозе ацэначных афіксаў.

Словаўтваральныя фарманты ў дыялектнай мове маюць шырокія канструкцыйныя магчымасці – яны спалучаюцца з разнастайнымі тыпамі ўтваральных асноў і набываюць шырокае кола словаўтваральных значэнняў. Галоўная роля ў дыялектным словаўтварэнні належыць суфіксацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нягледзячы на тое, што ў апошнія дзесяцігоддзі з'явілася шмат лінгвістычных даследаванняў па экспрэсіўным і эмацыянальна-ацэначным словаўтварэнні, да гэтага часу праблема кваліфікацыі слоў з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі застаецца нявырашанай: словы з суфіксамі эмацыянальнай ацэнкі з'яўляюцца формамі аднаго і таго ж слова ці гэта новыя самастойныя лексічныя адзінкі. Існуе некалькі навуковых поглядаў на гэтую праблему.

У рускай лінгвістыцы адны даследчыкі (М.В.Ламаносаў, К.С.Аксакаў, А.А.Шахматаў, В.У.Вінаградаў) лічаць, што, паколькі ў вытворных адзінках з суфіксамі эмацыянальнай ацэнкі не ўзнікае новых значэнняў, яны павінны разглядацца як формы слоў, а адпаведныя суфіксы – як формаўтваральныя. Аднак В.У.Вінаградаў побач са сцвярджэннем, што памяншальна-ласкальныя суфіксы з'яўляюцца формаўтваральнымі, адзначае: формы суб'ектыўнай ацэнкі назоўнікаў займаюць прамежкавае, пераходнае становішча паміж формамі слова і рознымі словамі [2, с. 101 – 102]. Такой жа думкі прытрымліваецца даследчыца А.А.Земская [3, с. 26].

А.І.Сабалеўскі, Р.І.Аванесаў, П.С.Кузняцоў, Н.М.Саралідзэ і іншыя даследчыкі разглядаюць дэрываты з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі як новыя самастойныя словы, а суфіксы, адпаведна, лічаць словаўтваральнымі. Гэты падыход грунтуецца на перакананні ў тым, што семантычная надбаўка (г. зн., суфікс) не толькі відазмяняе змест вытворнага слова, але і экспрэсіўна-эмацыянальную сутнасць, стылістычныя якасці яго, хоць прадметная суаднесенасць гэтага слова застаецца [4, с. 8]. На думку Б.В.Хрычыкава, суфіксы ацэнкі – словаўтваральныя: лексічнае значэнне слова – гэта не толькі дэнататыўнае значэнне, а і непарыўна звязанае з ім канататыўнае [5, с. 24].

У некаторых лінгвістаў (С.С.Плямаватая, Е.М.Галкіна-Федарук, Л.А.Кісялёва) назіраецца дыферэнцыяваны падыход да кваліфікацыі слоў са значэннем ацэнкі. Напрыклад, Е.М.Галкіна-Федарук словы з экспрэсіўнай афарбоўкай лічыць формамі аднаго і таго ж слова, а лексічныя адзінкі з памерным значэннем і са страчанай памяншальнасцю – словаўтваральнымі дэрыватамі [6, с. 105 – 124].

У беларускім мовазнаўстве таксама няма аднастайнасці поглядаў на словы з суфіксамі суб'ектыўнай ацэнкі: ”суфікс словаформаўтваральны ўтварае новую форму слова і разам з тым новае слова; гэта размерна-ацэначныя суфіксы, яны паказваюць на рэальную памяншальнасць ці павелічальнасць і адначасова на эмацыянальную ацэнку (*хаціна, газетка…*)” і “суфіксы суб'ектыўнай ацэнкі – суфіксы, якія ўтвараюць формы назоўнікаў з эмацыянальна-экспрэсіўным адценнем і выражаюць адносіны суб′екта да адпаведных прадметаў” [7, с. 144 – 145]. П.М.Чайкун разглядае ацэнку як неад'емную частку лексічнага значэння слова, а таму суфіксы, якія ўдзельнічаюць у яе перадачы, ён кваліфікуе як словаўтваральныя [8, с. 9].

Паколькі катэгорыя суб'ектыўнай ацэнкі змяшчае ў сабе вялікі пласт неаднароднай лексікі, утворанай шляхам суфіксацыі, то, на нашу думку, пастаноўка В.І.Максімавым пытання пра характар суфіксаў, якія ўжываюцца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працэсе дэрывацыі ацэначных лексічных адзінак, з'яўляецца правамернай [9,с. 108]. Сапраўды, у беларускай дыялектнай мове існуе вялікая колькасць суфіксаў, якія выкарыстоўваюцца для ўтварэння не новых слоў, а формаў і даюць гэтым лексічным адзінкам памерную або эмацыянальную ацэнку: *насаці**чак**, сыну**ленька**, ой**чынька**, дзі**цятка**, мам**зно**, нядбай**лік**, доч**ык**, басяч**уга**, гульта**юга**, маўчун**чык*** і пад.

Пры дапамозе іншых суфіксаў утвараюцца субстантывы са значэннем суб′ектыўнай ацэнкі, у якіх сема ацэначнасці ўжо была закладзена ў матывавальнай аснове (хітры – *хітр**ун***, скупы – *скуп**яга***, сляпы – *слеп**яндзя***, туляцца – *тул**яка***, хапаць – *хоп**эц***, крычаць – *крык**са*** і пад.), а словаўтваральны суфікс выражае толькі агульнае значэнне носьбіта прыкметы.

Калі ж адбываецца матывацыя нейтральнымі словамі, то з′яўленне эмацыянальна-ацэначнага кампанента звязана з семантыкай мадэлі і дапускаецца наяўнасць сем "вышэй // ніжэй нормы", "схільнасць да таго, што названа матывавальным словам" [10, с.18], напрыклад: *нас**ач**, валас**ач**, лаб**ан***.

Такім чынам, пры дэрывацыі ацэначнай лексікі вялікая роля надаецца не толькі суфіксам, але і ўтваральным асновам. Пацверджаннем таму можа лічыцца вялікі пласт ацэначнай лексікі ў беларускай дыялектнай мове. У якасці прыкладаў прывядзем некаторыя асабовыя назвы людзей паводле іх знешніх асаблівасцей і ўнутраных якасцей:

– *аддзеяслоўныя* ўтварэнні: *задзір**ава*** 'задзіра' (гом.), *хвал**ёга*** 'хвалько' (брэсц.), *пахвал**і́ўка*** 'хвалько' (гродз.), *шк**рома*** 'чалавек, які шаркае нагамі' (віц.), *мант**у́л*** 'непаважны чалавек' (маг.), *мі**тульга́*** 'рухавая асоба' (маг.), *балт**ухна́*** 'балбатуха' (віц.), *гарк**у́ша*** 'картавая' (гродз.), *морм**э́ля*** 'мармытун' (брэсц.), *сярдз**ю́чка*** 'хто сярдуе' (маг.);

– ад *прыметнікаў* ўтвараюцца наступныя ацэначныя назоўнікі: *кас**аве́нь*** 'касавокі' (мін.), *скуп**а́жа*** 'скупы' (гом.), *кара́**вашнік*** 'брудны чалавек' (маг.), *ра́б**за*** 'жанчына з рабым тварам' (маг.), *дурб**ове́ла*** 'дурны' (гом.), *скуп**о́ша*** 'скупы' (мін.), *хіт**ро́шча*** 'хітры чалавек' (маг.), *хітр**у́ня*** 'хітрая асоба' (маг.), *хітр**у́шча*** 'тс' (маг.), *здараў**чу́к*** 'фізічна здаровы чалавек' (маг.), *скуп**ынча́*** 'скупы' (брэсц.), *худ**ы́ша*** 'худы' (віц.);

– дэрываты, матываваныя *назоўнікамі*: *граш**аве́нь*** 'скупы' (мін.), *пейс**а́ха*** 'жанчына з непрыбранымі валасамі' (гом.), *чарап**е́нда*** ад чарапаха 'нязграба' (гродз.), *кап**е́ша*** 'тоўстая, здаровая жанчына' (віц.), *худ**э́бза*** 'худы' (гродз.), *пу́п**інак*** 'малы круглы чалавек' (гродз.), *стрыкул**і́ст*** ад стрыкуль 'зух, жулік' (маг.), *очк**оў́ня*** 'чалавек з вялікімі вачыма' (гом.), *свін**то́с*** 'няўдзячны чалавек' (маг.), *крамень**чу́к*** 'моцны, здаровы' (гом.), *лежн**ю́ка*** 'гультай' (брэсц.), *скупірдз**я́га*** 'скупы' (маг.), *нелюдз**яддзё*** ад нелюдзь 'нелюдзім' (маг.), *о́гн**янка*** 'спрытная жанчына' (брэсц.).

Акрамя пералічаных дэрыватаў, матываваных дзеясловамі, прыметнікамі і назоўнікамі, намі занатаваны ацэначныя дэрываты, ўтвораныя ад іншых часцін мовы: ад *гукапераймальных слоў – бал**у́та*** 'весялун, гаваркі чалавек' ад балу-балу (брэсц.), *тарар**а́ха*** 'балбатуха' ад та-ра-ра (гом.); *займенніка – ён**чык***

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

'хто часта гаворыць ён' (гом.); *прыслоўя – по́пэрэд**ня*** 'хто перабівае другіх – лезе поперад другіх' (брэсц.).

Вытворныя ацэначныя субстантывы ў беларускай дыялектнай мове складаюць вялікі пласт лексічных адзінак, што тлумачыцца жаданнем чалавека не толькі даць назву рэаліі аб'ектыўнай рэчаіснасці, але і ацаніць яе. Паколькі звычайна аб'ектам зносін выступае іншы чалавек, то ў мове мясцовых гаворак прысутнічае значная колькасць разнастайных у лексіка-семантычным і словаўтваральным аспектах субстантываў, якія характарызуюць асобу паводле асаблівасцей знешняга выгляду (узросту, колеру вачэй, скуры, фізічнай прыкметы), унутраных якасцей, паводле поўнага або частковага падабенства да аб'екта рэальнага свету і іншых крытэрыяў. З пункту гледжання ўжывальнасці суб'ектыўна-ацэначныя асабовыя адзінкі могуць быць як агульнаўжывальнымі, так і рэгіянальнымі.

Самым прадуктыўным і шырокаўжывальным пры словаўтварэнні ва ўсходнеславянскіх мовах з'яўляецца суфікс **-к-а**. Таму менавіта на прыкладах дэрыватаў, утвораных пры дапамозе суфікса **-к-а** можна разгледзець патэнцыяльныя магчымасці як самога фарманта, так і матывавальных асноў.

На думку даследчыка старабеларускай мовы М.А.Паўленкі, “намінацыі на *-к-а* са значэннем асобы жаночага полу – найбольш пашыраная катэгорыя слоў сярод жаночых асабовых назваў у беларускай мове 14-18 стст. Разнастайныя па сваім паходжанні і лексіка-семантычных прыметах, яны ўтвараліся ад розных па структуры іменных асноў. У спалучэнні з фармантам *-к-а* ўступалі, як правіла, асновы вытворныя, невытворныя і асновы складаных назоўнікаў <…>. Здольнасць суфікса *-к-а* спалучацца з такім шырокім колам <…> асноў сведчыць аб яго практычна неабмежаваных словаўтваральных магчымасцях у беларускай мове 14-18 стст.” [11, с. 29 – 44].

Суфікс *-к-а(-к-о)* можа надаваць дэрыватам розныя значэнні: памяншальна-ласкальнае, ацэначнае, стылістычную афарбоўку [12, с. 8 – 9]; аб'ектыўна-памяншальнае, аб'ектыўна-суб'ектыўнае, суб'ектыўна-ацэначнае [13, с. 9].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асабовыя назоўнікі са значэннем суб'ектыўнай ацэнкі, утвораныя пры дапамозе фарманта **-к-а(-к-о)**, складаюць самую вялікую групу ацэначнай лексікі ў беларускай дыялектнай мове і ўтвараюцца ад прыметнікаў, дзеепрыметнікаў, дзеясловаў, назоўнікаў і лічэбнікаў. Усе ацэначныя субстантывы, утвораныя пры дапамозе суфікса **-к-а(-к-о)**, можна размеркаваць па чатырох словаўтваральных тыпах.

1. Адпрыметнікавыя і аддзеепрыметнікавыя ацэначныя лексічныя адзінкі складаюць два падтыпы:

а) дэрываты жаночага роду, якія характарызуюць асоб паводле знешняга выгляду, унутраных якасцей або працэсуальнай прыкметы (аддзеепрыметнікавыя ўтварэнні). У якасці матывавальных выступаюць невытворныя і вытворныя асновы прыметнікаў і дзеепрыметнікаў. У працэсе дэрывацыі магчыма чаргаванне зычных в//ў, х'//ш, т//ц'; націск на аснове:

*абдзіра́нка, белабры́ска, бе́лка* 'светлавалосая', *брахлі́ўка, валаса́тка, гарбано́ска, гару́тка* 'працавітая', *глу́шка, дуро́нка* 'свавольніца', *захле́панка* 'неахайная', *карэ́ўка* 'тс', *лупа́цька* і інш. Ужыванне гэтых субстантываў суправаджаецца ацэначнымі адценнямі абражальнасці, пагардлівасці, радзей − спагадлівасці (*дуро́нка, гару́тка*). Падтып агульнабеларускі;

б) дэрываты агульнага роду, матываваныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі, якія характарызуюць асоб мужчынскага і жаночага полу па інтэнсіўнай знешняй прыкмеце і маюць ацэначныя адценні зневажальнасці, асуджэння, неадабрэння, іроніі. Націск на аснове або канчатку: *вандзо́нка* 'лянівы', *вуша́цько, ду́рко, загра́зенка* 'мурза', *карэ́лка* 'тс', *кацала́пка, краськó* 'чырванашчокі', *лы́сько, наду́цько, ням́ыцька, стры́жка* 'стрыжаны', *шму́лька* і інш. Падтып агульнабеларускі.

2. Ад дзеясловаў утвараюцца асабовыя назоўнікі жаночага і агульнага роду. Матывавальнымі выступаюць асновы інфінітываў, дзеясловаў цяперашняга або будучага часу (у некаторых выпадках поўнасцю): *бу́дзька* 'чалавек бывалы', *забу́дзька, зна́йка, тарадэ́йка* 'балаболка'. Асабовыя назоўнікі жаночага і агульнага роду характарызуюць асоб па схільнасці да пэўнага дзеяння або паводле працэсуальнай прыкметы. Фінальная частка матывавальнай асновы можа адсякацца: *барабо́лка* 'пляткарка', *варзёпка* 'пэцкала', *ву́садка* 'незамужняя жанчына', *гала́йка* 'крыкса', *дуцькó* 'крыўдлівы', *зажы́мка* 'скупая', *калды́бка* 'кульгавая', *разі́нька* 'разява', *уме́ка, уну́рко* 'пануры', *шны́порка* 'пранырa' і інш. У маўленні дэрываты набываюць ацэначныя адценні пагардлівасці, непахвальнасці. Тып агульнабеларускі.

3. Адназоўнікавыя субстантывы складаюць самую вялікую групу:

а) фемінатывы, утвораныя ад назоўнікаў мужчынскага і агульнага роду, маюць ацэначныя адценні зневажальнасці, пагардлівасці, асуджэння, іроніі, часам − спагадлівасці. Утваральнымі выступаюць асновы ацэначных назоўнікаў поўнасцю (*верхала́зка, вужля́чка* 'скрытная асоба', *вярціхво́стка, карду́пелька* 'нізкарослая жанчына', *круце́лька* 'непаседа', *пустадо́мка* 'нядбайная гаспадыня' і інш.) або ўсечаныя асновы (вымышлёнік − *вымышлёнка* 'песта', ґахавень − *ґа́хаўка* 'мажная асоба', галапупец − *галапу́пка* 'гарэза', ужыванец − *ужыва́нка* 'ласуха' і інш.). Падтып агульнабеларускі. Пры дэрывацыі магчыма чаргаванне зычных матывавальнай асновы: к//ч, в//ў; націск на аснове.

б) назоўнікі агульнага роду, якія характарызуюць асоб мужчынскага і жаночага полу паводле іх падабенства да таго, што названа матывавальным словам. Націск на перадсуфіксальным складзе, радзей на канчатку. Пры дэрывацыі магчыма марфаналагічна абумоўленае чаргаванне цвёрдых зычных асновы з мяккімі. У якасці матывавальных выступаюць асновы асабовых назоўнікаў: *дзеўчу́рка* 'юнак, які сябруе з дзяўчатамі', *хлопчу́рка* 'дзяўчынка, якая любіць хлапечыя кампаніі' і неасабовых: *барэ́лко* 'таўстун', *бо́бка* 'невысокая жанчына', *краськó* 'прыгажун', *лапо́цько* 'вахлак', *лахмо́цько* 'абадранец', *но́сько* 'чалавек з вялікім носам', *ню́нька* 'негаваркі чалавек', *рабо́цько* 'дрэнны работнік' і *рабацькó* 'працаўнік', *ро́цька* 'разява', *слепо́цько*,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*слінькó* 'слінявы'. У маўленні лексічныя адзінкі набываюць ацэначныя адценні пагардлівасці, асуджэння і пахвальнасці (*рабацькó*). Падтып агульнабеларускі.

У беларускай дыялектнай мове, як і ў літаратурнай, назоўнікі жаночага, мужчынскага і агульнага роду, якія утвараюцца пры дапамозе суфікса **-к-а** і маюць ацэначныя адценні памяншальнасці, ласкальнасці або памяншальна-ласкальнае, складаюць вялікую групу суфіксальных субстантываў катэгорыі суб'ектыўнай ацэнкі: *ахламóнька, балдэ́ска, сы́нка, хлапчы́нка, дзéдка, дóнька, дзіцянкó, людзíнка, мáмка, удóўка, свáтко, тáтко, хозя́інко, сірацíнка* і інш.

Назоўнікі з фармантам *-к-а(-к-о)* могуць мець узмацняльную ступень ласкальнасці, калі яны ўтвараюцца ад субстантываў з суфіксамі: ***-к-а***: *бáбачка, дóчачка, кірпáчачка, дундýчачка, курдýпачка, малю́тачка, залóвачка, небарáчка, тэ́ечка* (ад тэйка 'сяброўка'), *цётачка* і інш.; ***-іц-а (-ыц-а)***: *маладзíчка* і *молодзíцка, пляме́ннічка, сястры́цка* і інш.; ***-аг-а(-яг-а)***: бідняга − *бідня́жка*; ***-ус-я(-юс-я)***: дарагуся − *дарагýська*; ***-ух-а***: *лапатýшка, лепятýшка, пасялýшка* 'аматарка хадзіць на сяло', *старýшка, сястрýшка, пацягýшка* 'валацуга', *хахатýшка* і інш.

Да суб’ектыўна-ацэначнай лексікі адносяцца дэрываты, утвораныя ад вытворных асноў назоўнікаў жаночага, мужчынскага і агульнага роду з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі ***-к-а***: *ахламóнічка, разíнечка, сы́начка, хахатýшачка, гарýшачка, дзéтачка, дóнечка, мáмачка, тáтачка* і інш.; ***-ул-я***: *бабýлька, матýлька, татýлька, мамýлька, сынýлька, сястрýлька* і інш.; ***-ус-я***: *мамýська*; ***-ун-я***: *бабýнька* і інш. Пры далучэнні суфікса *-к-а* да вытворнай асновы назоўніка з пералічанымі ацэначнымі фармантамі ўтвараецца другая ступень суб'ектыўнай ацэнкі.

У некаторых словах магчыма вылучэнне суфікса **-к-а** са значэннем трэцяй ступені суб'ектыўнай ацэнкі: *мама − мамýля − мамýлька − мамýлечка, рабзá* 'жанчына з рабым тварам' – *рабзýля − рабзýлька − рабзýлечка, сын − сынýля − сынýлька − сынýлечка*.

4. Невялікую групу ацэначнай лексікі складаюць назоўнікі, утвораныя ад лічэбнікаў: *пятнáццатка* 'немаладая жанчына, якая не была замужам і паводзіць сябе як маладая дзяўчына', *шаснáццатка* 'тс', *семнáццатка* 'тс'. У маўленні ўжываюцца з адценнямі іроніі і непахвальнасці. Тып рэгіянальны (брэсц., гом., маг., мін.).

Такім чынам, словаўтваральныя фарманты ў дыялектнай мове маюць шырокія канструкцыйныя магчымасці – яны спалучаюцца з разнастайнымі тыпамі ўтваральных асноў і набываюць шырокае кола дэрывацыйных значэнняў. Адзін і той жа фармант можа выкарыстоўвацца ў розных словаўтваральных тыпах, але мець неаднолькавыя дэрывацыйныя магчымасці. Пры дапамозе аднаго і таго ж дэрывацыйнага сродку могуць утварацца суб'ектыўна-ацэначныя адзінкі з рознымі значэннямі: 'асоба – суб'ект дзеяння', 'асоба – носьбіт прыкметы', 'намінацыя асобы па тым, што названа ўтваральным словам' і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Галоўная роля ў дыялектным словаўтварэнні належыць суфіксацыі. У працэсе дэрывацыі найменняў-характарыстык асобы адбываюцца розныя марфаналагічна абумоўленыя працэсы: чаргаванні парных цвёрдых і мяккіх зычных утваральнай асновы, галосных, заднеязычных з шыпячымі; усячэнне або нарашчэнне матывавальнай асновы.

Літаратура:

1. Шакун Л.М. Словаўтварэнне: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў – Мінск: Выш. шк., 1978. – 128 с.

2. Виноградов В.В. Русский язык: Грамматическое учение о слове – 3-е изд., исправ. – М.: Высш. шк., 1986. – 640 с.

3. Земская Е.А. Современный русский язык: Словообразование – М.: Просвещение, 1973. – 304 с.

4. Саралидзе Н.М. Суффиксальный способ выражения субъективной оценки в русском и грузинском языках (в сопоставительном плане): автореф. дис. … канд. филолог. наук: 10.02.01 / Н.М.Саралидзе; Акад. наук СССР. Ленинградский отдел ин-та языкозн. – Л., 1979. – 29 с.

5. Хрычиков Б.В. Категория модальности, ее объём и средства выражения в современном русском языке: автореф. дис. … д-ра филолог. наук: 10.02.01 / Б.В.Хрычиков; Днепропетровский гос. ун-т им. 300-летия воссоединения Украины с Россией. – Днепропетровск, 1986. – 36 с.

6. Галкина-Федорук Е.М. Об экспрессивности и эмоциональности в языке / Е.М.Галкина-Федорук // Сборник статей по языкознанию / МГУ – М., 1958. – С. 103 – 124.

7. Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк А.А. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў – Мінск: Выш. шк., 1990. – 222 с.

8. Чайкун П.М. Производные существительные с коннотативным значением в белорусском и русском языках: автореф. дис. … канд. филолог. наук: 10.02.02, 10.02.01 / П.М.Чайкун; Акад. наук БССР. Ин-т языкозн. им. Я.Колоса. – Минск, 1987. – 17 с.

9. Максимов В.И. Стилистические, оценочные и экспрессивные свойства суффиксов / В.И.Максимов // Материалы по русско-славянскому языкознанию: Труды Воронежского гос. ун-та – Воронеж, 1969. – Т. 83. – С. 105 – 115.

10. Долгов И.А. Образование суффиксальных эмоционально-оценочных наименований лица в современном русском языке: автореф. дис. … канд. филолог. наук: 10.02.01 / И.А. Долгов; Киевский гос. ун-т им. Т.Г. Шевченко. – Киев, 1984. – 23 с.

11. Паўленка М.А. Нарысы па беларускаму словаўтварэнню: Жаночыя асабовыя намінацыі ў старабеларускай мове – Мінск: БДУ імя В.У.Леніна, 1978. – 135 с.

12. Малюк А.К. Способы образования и стилистическое функционирование эмоциональной лексики полесского фольклора: автореф.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дис. … канд. филолог. наук: 10.02.02 / А.К.Малюк; Бел. гос. ун-т им. В.И.Ленина. – Минск, 1980. – 16 с.

13. Ковалев Н.С. Размерно-оценочные образования (на материале украинских говоров Воронежской области): автореф. дис. … канд. филолог. наук: 10.662 / Н.С.Ковалев; Воронежский ун-т им. Ленинского комсомола. – Воронеж, 1970. – 15 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ